2. Лингвистические и психологические стратегии полиглотов; Флинта, Наука – Москва, 2014. – 304с.

**Abstract.** The game is an effective method in teaching Russian as a foreign language.

УДК 378.147

**Мантур А.Я.,** старшы выкладчык
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## АСАБЛІВАСЦІ КАНСТРУЯВАННЯ І АРГАНІЗАЦЫІ ПА МОДУЛЬНАЙ ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаюцца асаблівасці канструявання і арганізацыі модульнай тэхналогіі навучання. Блокі-модулі могуць быць трох тыпаў: пазнавальныя, аперацыйныя і змешаныя. Ацэнка паспяховасці навучання студэнтаў у рэйтынгавай сістэме ажыццяўляецца ў ходзе бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю.*

Модульнае навучанне ўзнікла як альтэрнатыва традыцыйнаму на пачатку 1960-х гадоў XX стагоддзя ў навучальных установах ЗША і Заходняй Еўропы. Асаблівасці праектавання і рэалізацыі гэтага метаду даволі шырока пададзены ў манаграфіях расійскіх вучоных Таццяны Шамавай, Дзмітрыя Левітэса і інш. Модульная тэхналогія адрозніваецца ад традыцыйнай і іншых методык тым, што сам змест навучання звычайна прапануецца ў выглядзе інфармацыйна закончаных блокаў.

Прадстаўлены навучальны метад мае ўжо даволі значную практыку, назапашаны вопыт яго рэалізацыі ў навучальных установах, аб ім напісана шмат прац, але сярод вучоных і педагогаў-практыкаў існуюць разнастайныя погляды як на змест самага паняцця “модуль”, так і на яго падыходы да канструявання модульных праграм. Спынімся на тых падыходах, якія, на нашу



Репозиторий БГАТУ

думку, будуць найбольш эфектыўнымі на ўроках мовы і літаратуры ў сучаснай беларускай школе.

Модуль (лац. *modul* – мера) – гэта мэтавы функцыянальны вузел, у якім навучальны змест і тэхналогія авалодання ім аб'яднаныя ў сістэму высокага ўзроўню цэласнасці [3].

**Блокі-модулі** могуць быць трох тыпаў: пазнавальныя, аперацыйныя і змешаныя.

*Пазнавальныя (інфармацыйныя)* выкарыстоўваюцца выкладчыкамі пры вывучэнні асноў асобных навук.

*Аперацыйныя* ўжываюцца з мэтай фарміравання і развіцця ў студэнтаў умення праводзіць пэўнымі спосабамі розныя аперацыі.

*Змешаныя* блокі-модулі аб'ядноўваюць у сабе адначасова першы і другі тыпы. У навучальных установах найбольш папулярны менавіта гэты тып [2, с. 89 – 91].

Блок-модуль уключае наступныя кампаненты:

1) тэарэтычны вучэбны матэрыял праграмы;

2) змест семінарскіх і практычных заняткаў;

3) пытанні і заданні для самакантролю;

4) змест самастойнай вучэбнай працы;

5) літаратуру для самастойнага вывучэння;

6) пытанні для кантролю пры засваенні вучэбнага матэрыялу;

7) формы арганізацыі кантролю (кантрольная работа, тэсціраванне і інш.);

8) крытэрыі ацэнкі.

Характэрнай асаблівасцю модульнага навучання з'яўляецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі паспяховасці навучання, асноўнымі мэтамі якой з'яўляюцца:

1) стварэнне аб'ектыўных крытэрыяў пры выяўленні кандыдатаў на прадаўжэнне адукацыі ў рамках шматузроўневай сістэмы навучання;

2) зніжэнне выпадковасці пры здачы экзамену.

Ацэнка паспяховасці навучання студэнтаў у рэйтынгавай сістэме ажыццяўляецца ў ходзе бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю [1, с. 259 – 261].

*Бягучы кантроль* – ажыццяўляецца выкладчыкам на занятках мовы ў паўсядзённай працы. Формамі бягучага кантролю могуць быць індывідуальныя апытанні або пісьмовыя заданні.

Репозиторий БГАТУ

*Прамежкавы кантроль* праводзіцца звычайна па вывучанай, лагічна закончанай частцы – пэўным раздзеле вучэбнай праграмы, пэўнай манаграфічнай тэме па мове. Гэтым відам кантролю можна праверыць даволі вялікі аб’ём матэрыялу, а гэта значыць, што выкладчык павінен у час падбору заданняў прад’яўляць павышаныя патрабаванні.

*Выніковы кантроль* – ажыццяўляецца пры завяршэнні вывучэння пэўнай дысцыпліны ці курса. Гэта можа быць экзамен або залік па беларускай мове.

На падставе рэйтынгавай сістэмы па кожнаму модулю ацэньваецца практычна ўсё: наведванне студэнтамі заняткаў, выкананне заданняў, пачатковы, прамежкавы і выніковы ўзровень падрыхтоўкі. Па кожнаму курсу незалежна ад працягласці яго вывучэння праводзіцца не больш за тры модулі. Курсавыя работы, праекты, дыпломныя работы ўяўляюць сабой самастойныя модулі, па якім распрацоўваюцца аналагічныя заданні і крытэрыі іх рэйтынгавай ацэнкі.

Модульнае навучанне грунтуецца на канкрэтных паказчыках, а рэйтынгавая адзнака эфектыўнасці навучання студэнтаў дазваляе ў пэўнай ступені дакладна характарызаваць якасць іх падрыхтоўкі.

Арганізацыя модульнага навучання, звязаная з упарадкаваннем яго зместу, кіраўніцтва і кантролю, з’яўляецца вельмі працаёмкай для выкладчыкаў і патрабуе ад іх вялікага прафесіяналізму. Для прымянення модульнага навучання неабходна правесці вялікую навуковую працу па вызначэнні зместу модуляў, па падрыхтоўцы па кожнаму з іх заданняў і тэстаў, якое мае на мэце ацаніць веды, уменні і навыкі студэнтаў па беларускай мове.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Основы психологии и педагогики: Учеб. пособие / Н.А. Березовин. – Минск, 2004. – 336 с.

2. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры / М.В. Жуковіч. – Мінск, 2015. – 252 с.

3. Современные образовательные технологии / Д.Г. Левитес. – Новосибирск, 1999. – 288 с.

4. Современные педагогические и информационные технологии в системе образования / Е.С. Полат. – Москва, 2008. – 368 с.

Репозиторий БГАТУ

5. Современные образовательные технологии / В.Г. Селевко. – Москва, 1998. – 256 с.

**Abstract.** The features of the design and organization of modular learning technology are discussed in the article. Blocks-modules can be of three types: cognitive, operational and mixed. Evaluation of the success of students ' training in the rating system is carried out by the current, intermediate and final control.

УДК 37.01:94

**Мяньчэня С.В.,** старшы выкладчык
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ ТЭХНІЧНАГА ПРОФІЛЮ

***Анатацыя.*** *Ва ўмовах рэфармавання вышэйшай школы паўстае пытанне аб месцы гістарычных дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў featured рознага профілю, у тым ліку тэхнічнага. Для адаптацыі дадзеных дысцыплін для патрэб часу і грамадства прапануецца ажыццявіць пераход да праблемных гістарычных курсаў, праводзіць працу па стымуляванню самастойнай працы студэнтаў і папулярызацыі гістарычных ведаў.*

Грамадзянскія пачуцці і жыццёвая пазіцыя будучага спецыяліста на прамую залежыць ад паспяховага засваення матэрыяла дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага блока і фарміравання адпаведных кампетэнцый. Гуманітарныя дысцыпліны, асабліва гістарычныя, акрамя фарміравання навыкаў аналіза, крытычнага разумення, маўлення, выконваюць выхаваўчую і ідэалагічную функцыю. У сувязі з гэтым на выкладчыкаў лажыцца адказнасць за падрыхтоўку не толькі спецыяліста, але і патрыёта-грамадзяніна, ад якога будзе залежыць эканамічная і палітычная бяспека дзяржавы, і адмаўляць значэнне



Рэпазіторый БГАТУ